Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па адукацыі
ў галіне культуры і мастацтваў

# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА.
# Раздзел II. ТЭОРЫЯ

*Тыпавая вучэбная праграма
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць
(па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Ж. Л. Раманава,* старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*вучоны* савет дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Р. С. Матульскі*, дырэктар дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», доктар педагагічных навук, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 19.02.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 15.03.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 22.03.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Ж. Л. Раманава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэказнаўства» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэказнаўства» складаецца з двух раздзелаў: «Тэорыя» і «Гісторыя». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння другога раздзела «Тэорыя».

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэказнаўства. Раздзел ІІ. Тэорыя» звязана міжпрадметнымі сувязямі з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія», «Бібліятэказнаўства. Раздзел І. Гісторыя», «Бібліяграфазнаўства. Раздел І. Тэорыя», вучэбнай дысцыплінай установы вышэйшай адукацыі «Інфармацыйная культура асобы» і, у сваю чаргу, з’яўляецца тэарэтычнай базай для больш эфектыўнага і якаснага засваення студэнтамі іншых вучэбных дысцыплін спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

*Асноўнай мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэказнаўства. Тэорыя» з’яўляецца фарміраванне прафесійнай кампетэнцыі спецыялістаў, накіраванае на забеспячэнне эфектыўнай дзейнасці па задавальненні інфармацыйных патрэб грамадства праз сістэму бібліятэк на базе засваення тэарэтычных асноў бібліятэчнай справы і здольнасці прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы.

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэказнаўства. Раздзел ІІ. Тэорыя» забяспечвае метадалагічную і агульнатэарэтычную базу прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. У ім разглядаецца станаўленне і развіццё бібліятэказнаўства, яго тэрмінасістэмы, метадалогіі і методыкі, вызначаюцца кірункі развіцця бібліятэкі як сацыяльнага інстытута з уласцівымі яму спецыфічнымі функцыямі, прынцыпамі дзейнасці і арганізацыйнай структурай, вывучаюцца сучасны стан, праблемы і перспектывы развіцця бібліятэк розных тыпаў і відаў, бібліятэчных сетак і сістэм, кіравання бібліятэчнай справай. Праблемны характар разгляду тэарэтычных пытанняў, праецыраванне іх на практычную дзейнасць бібліятэк спрыяе фарміраванню прафесій-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага светапогляду, здольнасцей да аналізу і вызначэння шляхоў удасканалення бібліятэчнай справы.

*Асноўнымі задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– вывучэнне тэрміналагічнай сістэмы, асноўных тэарэтычных палажэнняў бібліятэказнаўства;

– разгляд эвалюцыі бібліятэказнаўства як самастойнай, гуманістычна арыентаванай навуковай дысцыпліны, якая мае высокі статус і шырокія міжпрадметныя сувязі;

– вызначэнне асаблівасцей бібліятэк розных тыпаў і відаў і спецыфікі вырашаемых імі задач і выконваемых функцый;

– фарміраванне ўяўленняў аб сістэмным характары бібліятэчнай справы.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя агульнатэарэтычныя пытанні бібліятэказнаўства: яго функцыі, задачы, заканамернасці развіцця, аб’ект і прадмет, структуру, статус;

– метадалогію і методыку бібліятэказнаўства;

– этапы станаўлення і развіцця тэорыі бібліятэказнаўства;

– асаблівасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута; прычыны яе ўзнікнення і аснову функцыянавання;

– прынцыпы, функцыі і тыпалогію бібліятэк, асаблівасці дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў;

– шматконтурную сутнасную сістэмную мадэль бібліятэкі;

– структуру і асаблівасці функцыянавання бібліятэчных сетак і сістэм;

– сутнасна-функцыянальную структуру бібліятэчнай справы;

*умець:*

– выкарыстоўваць бібліятэказнаўчыя тэрміны і азначэнні ў ходзе камунікацыі ў працэсе вучэбнай і прафесійнай дзейнасці;

– дакладна фармуляваць задачы, заканамернасці, аб’ект і прадмет бібліятэказнаўства, структуру, усталёўваць узаемасувязі бібліятэказнаўства з іншымі навуковымі дысцыплінамі;

– вызначаць тыпы і віды бібліятэк, прымяняць атрыманыя веды пры ацэнцы сутнасных і вытворных функцый бібліятэк розных тыпаў і відаў, іх інфармацыйных рэсурсаў і кірункаў дзейнасці;

*валодаць:*

– асноўнымі паняццямі і тэрмінамі тэорыі бібліятэказнаўства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– алгарытмам аналізу эвалюцыі розных тыпаў і відаў бібліятэк, прынцыпамі іх дзейнасці.

Неабходнасць засваення вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэказнаўства. Раздзел II. Тэорыя» выклікана патрабаваннямі да прафесіянальнай бібліятэказнаўчай кампетэнцыі бібліятэкарабібліёграфа, які павінен валодаць ведамі і ўменнямі, неабходнымі для разумення, развіцця і ўдасканалення бібліятэчнай справы.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэказнаўства. Раздзел II. Тэорыя» для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Выконваць бібліятэчна-інфармацыйныя тэхналагічныя працэсы ў асяроддзі сучасных АБІС.

ПК-2. Фарміраваць бібліятэчны фонд з улікам выкарыстання разнастайных крыніц і сродкаў яго камплектавання, асаблівасцей уліку і апрацоўкі, размяшчэння, расстаноўкі і захавання.

ПК-3. Ажыццяўляць каталагізацыю дакументаў і падтрымку электроннага каталога.

ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў розных сфер дзейнасці.

ПК-5. Весці бібліятэчнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-6. Ажыццяўляць традыцыйную і электронную выдачу і дастаўку дакументаў.

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

ПК-12. Вывучаць, аналізаваць і ўкараняць сусветны вопыт інавацыйнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю.

ПК-15. Выкарыстоўваць сучасныя дасягненні навукі і перадавых тэхналогій і ўкараняць іх у практычную дзейнасць.

ПК-16. Выкарыстоўваць метады навуковых даследаванняў у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-17. Арганізоўваць і праводзіць навуковыя даследаванні; вывучаць эфектыўнасць бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-18. Выконваць патрабаванні заканадаўчых і нарматыўна-прававых дакументаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-23. Укараняць прынцыпы інавацыйнага менеджменту і сістэмы менеджменту якасці ў работу бібліятэкі.

ПК-37. Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

У мэтах павышэння якасці навучання і засваення ведаў пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэказнаўства. Раздзел II. Тэорыя» выкарыстоўваюцца педагагічныя тэхналогіі праблемнага навучання, прымяняюцца актыўныя метады навучання, накіраваныя на актывізацыю разумовай дзейнасці студэнтаў: кейс-метад, метад круглага стала і актыўнага дыялогу.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэказнаўства» для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) усяго прадугледжана 216 гадзін, з іх 120 – аўдыторныя заняткі. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэказнаўства. Раздзел II. Тэорыя» прадугледжана 126 гадзін, з іх 70 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 42 гадзіны, семінарскія заняткі – 28 гадзін. Рэкамендаванай формай выніковага кантролю з’яўляецца экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінарскія заняткі |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Тэарэтычныя асновы бібліятэказнаўства** | | | |
| *Тэма 1.* Агульнатэарэтычныя пытанні бібліятэказнаўства | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 2.* Метадалогія і навуковая методыка бібліятэказнаўства | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Статус бібліятэказнаўства і яго месца ў сістэме навук | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Генезіс і развіццё бібліятэказнаўства | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел II. Асновы вучэння аб бібліятэцы** | | | |
| *Тэма 5.* Генезіс і сутнасць бібліятэкі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 6.* Прынцыпы дзейнасці бібліятэк | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 7.* Сацыяльныя і тэхналагічныя функцыі бібліятэк | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Шматконтурная сутнасная мадэль сістэмы «Бібліятэка» | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Тыпалагізацыя і класіфікацыя бібліятэк | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел III. Бібліятэчная справа як галіна дзейнасці** | | | |
| *Тэма 10.* Агульная характарыстыка бібліятэчнай справы | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 11.* Бібліятэчныя сеткі і сістэмы | 10 | 4 | 6 |
| *Тэма 12.* Кіраванне бібліятэчнай справай | 4 | 2 | 2 |
| **Разам…** | **70** | **42** | **28** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэказнаўства. Раздзел II. Тэорыя». Сувязь і суадносіны з іншымі агульнанавуковымі, агульнапрафесійнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі. Значэнне ў агульнанавуковай і прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Аб'ём і структура. Асноўныя формы аўдыторных заняткаў. Самастойная работа студэнтаў, неабходная для якаснага засваення матэрыялу. Забеспячэнне раздзелаў вучэбна-метадычнымі матэрыяламі. Формы кантролю.

## Раздзел I. Тэарэтычныя асновы бібліятэказнаўства

### *Тэма 1. Агульнатэарэтычныя пытанні бібліятэказнаўства*

Дэфініцыя паняцця «бібліятэказнаўства». Заканамернасці развіцця, задачы, функцыі бібліятэказнаўства. Вызначэнне аб'екта і прадмета бібліятэказнаўства як навуковая праблема. Эвалюцыя поглядаў бібліятэказнаўцаў на аб'ект і прадмет бібліятэказнаўства. «Бібліятэчная справа» як аб'ект бібліятэказнаўства. Канцэпцыі аб'екта і прадмета В. В. Скварцова, Ю. М. Сталярова, Ю. М. Мяленцьевай, В. П. Лявонава. Структура бібліятэказнаўства як навукі, навуковай і вучэбнай дысцыпліны. Характарыстыка дысцыплін бібліятэказнаўчага цыкла.

Асноўныя канцэпцыі навуковага пазнання ў бібліятэказнаўстве. Фармальна-тэхнічная канцэпцыя. Погляды на бібліятэку і бібліятэказнаўства М. Шрэцінгера, Л. Б. Хаўкінай. Дакументалісцкая канцэпцыя. Погляды Ю. М. Сталярова, В. І. Цярэшына. Інфармацыйная канцэпцыя В. В. Скварцова. Кагнітыўная канцэпцыя сутнасці бібліятэказнаўства А. І. Астапава.

### *Тэма 2. Метадалогія і навуковая методыка бібліятэказнаўства*

Дэфініцыя і суадносіны паняццяў «метадалогія», «метадалогія бібліятэказнаўства», «навуковая методыка», «метад». Метадалогія бібліятэказнаўства як сістэма асноватворных прынцыпаў і спосабаў пазнання, арганізацыі і пабудовы тэарэтычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці. Філасофія і логіка як метадалагічная аснова бібліятэказнаўства.

Сістэма метадаў бібліятэказнаўчых даследаванняў. Агульналагічныя метады: аналіз, сінтэз, эксперымент, назіранне, мадэляванне. Агульнанавуковыя метады бібліятэказнаўчых даследаванняў: тэрміналагічны аналіз, метад аперацыяналізацыі паняццяў, кантэнт-аналіз, апытанне, метад экспертных ацэнак. Спецыяльныя метады бібліятэказнаўчых даследаванняў: метады вывучэння бібліятэчнага фонду і карыстальнікаў бібліятэк. Выкарыстанне метадаў бібліятэказнаўчых даследаванняў у практычнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 3. Статус бібліятэказнаўства і яго месца ў сістэме навук*

Развіццё поглядаў на статус бібліятэказнаўства і яго месца ў сістэме навуковых ведаў. Статус бібліятэказнаўства як самастойнай навукі гуманітарнага цыкла. Міждысцыплінарны характар бібліятэказнаўства.

Узаемасувязь бібліятэказнаўства з філасофіяй, логікай, гісторыяй, тэорыяй культуры.

Узаемасувязь бібліятэказнаўства з роднаснымі навукамі: кнігазнаўствам, бібліяграфазнаўствам, інфарматыкай.

Узаемасувязь бібліятэказнаўства з гуманітарнымі навукамі: педагогікай, псіхалогіяй, сацыялогіяй, эканомікай, менеджментам.

Узаемасувязь бібліятэказнаўства з дакладнымі навукамі.

### *Тэма 4. Генезіс і развіццё бібліятэказнаўства*

Перыядызацыя бібліятэказнаўства. Асаблівасці бібліятэказнаўчай думкі старажытнасці, Сярэдневякоўя, Новага часу. Уплыў дзейнасці В. М. Тацішчава, В. Г. Бакмейстэра, В. В. Кіпрыянава, М. В. Ламаносава на развіццё бібліятэказнаўчай думкі ў Расіі.

Эканамічныя прычыны, якія спрыялі развіццю бібліятэказнаўства як навуковай і вучэбнай дысцыпліны ў XIX ст. Погляды на бібліятэказнаўства М. Шрэцінгера і А. Грэзеля. Узнікненне ў Еўропе і ЗША першых прафесійных аб’яднанняў і часопісаў.

Развіццё бібліятэказнаўства ў Расіі ў XIX ст. Дзейнасць В. І. Сабальшчыкова, М. А. Рубакіна, К. М. Дзерунова,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. А. Пакроўскага, К. І. Рубінскага, Л. Б. Хаўкінай. Іх погляды на аб'ект, прадмет, структуру, статус бібліятэказнаўства і інш.

Развіццё бібліятэказнаўства ў XX ст. Работы Ш. Р. Ранганатана, Д. Х. Шыры, П. Батлера. Дакументы ІФЛА, ЮНЕСКА.

Этапы развіцця бібліятэказнаўства ў савецкі перыяд. Адметныя рысы «сацыялістычнага» і «буржуазнага» бібліятэказнаўства. Вырашэнне асноўных бібліятэказнаўчых праблем. Дзейнасць А. М. Ванеева, Ю. В. Грыгор'ева, М. С. Карташова, В. В. Скварцова, Ю. М. Сталярова, А. С. Чубар'яна і інш.

Змена праблематыкі бібліятэказнаўства ў постсавецкі перыяд. Дзейнасць Н. В. Жадзько, Р. С. Матульскага, І. Г. Селіверставай, В. В. Скварцова, М. С. Слабадзяніка, Ю. М. Сталярова і інш. Новыя погляды на сутнасць, прынцыпы, функцыі, тыпалогію бібліятэк.

Асаблівасці бібліятэказнаўства Беларусі. Дзейнасць І. Б. Сіманоўскага, Я. І. Хлябцэвіча, М. В. Масенжнік, М. І. Пакала, сучасных бібліятэказнаўцаў.

Арганізацыйная структура бібліятэчнай навукі ў Рэспубліцы Беларусь. Развіццё бібліятэказнаўства на спецыяльных кафедрах БДУКМ і ў навуковых падраздзяленнях буйных навуковых універсальных і спецыяльных бібліятэк.

## Раздзел ІІ. Асновы вучэння аб бібліятэцы

### *Тэма 5. Генезіс і сутнасць бібліятэкі*

Прычыны ўзнікнення і развіцця бібліятэкі. Інфармацыйныя патрэбы як першапрычына ўзнікнення бібліятэкі. Іх адметныя асаблівасці, месца ў сістэме патрэб чалавека. Фарміраванне інфармацыйных патрэб у працэсе дзейнасці чалавека. Бібліятэка як сацыяльны інстытут, накіраваны на збор, захоўванне, распаўсюджванне дакументаў і задавальненне інфармацыйных патрэб карыстальнікаў.

Дакумент і нааінфармацыя як аснова функцыянавання бібліятэкі. Механізм фарміравання нааінфармацыі і з'яўлення дакументаў. Асноўныя ўласцівасці нааінфармацыі. Неабходнасць фіксацыі нааінфармацыі на матэрыяльным носьбіце. Дакумент як матэрыяльны носьбіт з замацаванай на ім інфармацыяй. Сінхронныя і дыяхронныя дакументы: іх азначэнне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласцівасці, перавагі, недахопы. Дыяхронныя дакументы як аснова функцыянавання бібліятэкі.

Погляды бібліятэказнаўцаў на сутнасць бібліятэкі. Бібліятэка як кнігасховішча, упарадкаваная сукупнасць дакументаў, установа, сацыяльны інстытут (А. А. Пакроўскі, Л. Б. Хаўкіна, А. С. Чубар'ян, Ю. М. Сталяроў, А. В. Сакалоў, А. Я. Чарняк, Ю. П. Мяленцьева, Р. С. Матульскі, Н. В. Жадзько, С. А. Басаў). Адметныя асаблівасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута. Функцыі і атрыбуты бібліятэкі як сацыяльнага інстытута. Бібліятэка як інтэгратыўны сацыяльны інстытут (Р. С. Матульскі). Месца і роля бібліятэкі сярод іншых сацыяльных інстытутаў.

Сучасныя канцэпцыі бібліятэкі: бібліятэка як інтэлект-цэнтр; інфармацыйны цэнтр, які ажыццяўляе доступ да электронных выданняў; цэнтр міжкультурных камунікацый; полікультурная бібліятэка; камунікацыйная бібліятэка; сучасная вясковая бібліятэка; гібрыдная бібліятэка; бібліятэка-каворкінг і інш. (В. К. Сцяпанаў, Е. Ю. Геніева, Т. М. Кузьмішына, В. П. Лявонаў, А. В. Сакалоў, Р. С. Матульскі, М. Я. Дворкіна, С. А. Езава, С. Г. Матліна і інш.).

*Тэма 6. Прынцыпы дзейнасці бібліятэк*

Эвалюцыя поглядаў бібліятэказнаўцаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк. Прынцып камуністычнай партыйнасці як асноватворны прынцып дзейнасці савецкіх бібліятэк. Рэалізацыя прынцыпу партыйнасці ў працэсе камплектавання бібліятэчных фондаў, класіфікацыі і сістэматызацыі, абслугоўванні карыстальнікаў. Развіццё поглядаў бібліятэказнаўцаў на прынцыпы дзейнасці бібліятэк у постсавецкі перыяд. Прынцыпы дзейнасці бібліятэк, замацаваныя ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь («Канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь», Закон «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь»).

Вызначэнне прынцыпаў дзейнасці бібліятэк у адпаведнасці з тэорыяй каштоўнасцей (Р. С. Матульскі). Суб'екты каштоўнасцей. Віды і ўзроўні каштоўнасцей. Прынцып адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям у дзейнасці бібліятэк: групы агульначалавечых каштоўнасцей, сутнасць гэтага прынцыпу, рэалізацыя яго ў дзейнасці бібліятэк. Прынцып адпаведнасці нацыянальным каштоўнасцям: мова і культура як нацыяналь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя каштоўнасці; сутнасць гэтага прынцыпу, рэалізацыя яго ў дзейнасці бібліятэк. Прынцып адпаведнасці каштоўнасцям сацыяльных груп: віды сацыяльных груп, асаблівасці іх каштоўнасцей, рэалізацыя гэтых каштоўнасцей у дзейнасці бібліятэк. Прынцып адпаведнасці каштоўнасцям індывіда: сістэма каштоўнасцей індывіда, дзейнасць бібліятэкі па фарміраванні і забеспячэнні рэалізацыі індывідуальных каштоўнасцей.

*Тэма 7. Сацыяльныя і тэхналагічныя функцыі бібліятэк*

Эвалюцыя поглядаў бібліятэказнаўцаў на функцыі бібліятэк у залежнасці ад разумення сутнасці бібліятэкі. Сістэмны падыход да вызначэння функцый бібліятэкі (Ю. М. Сталяроў, Р. С. Матульскі). Сацыяльныя (знешнія) функцыі і тэхналагічныя (унутраныя) функцыі бібліятэк. Сацыяльныя функцыі бібліятэк як ажыццяўленне бібліятэкай сваёй ролі сацыяльнага інстытута. Сутнасныя (галоўныя) сацыяльныя функцыі бібліятэк: азначэнне і адметныя ўласцівасці. Кумулятыўная, мемарыяльная і камунікатыўная функцыі бібліятэк: іх характарыстыка, праяўленне ў дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў, узаемасувязі і супярэчнасці. Вытворныя сацыяльныя функцыі: азначэнне, асноўныя ўласцівасці. Віды вытворных функцый: забеспячэнне адукацыі і выхавання, навукі і вытворчасці, культуры, ідэалагічная, бібліятэрапеўтычная, сацыялізуючая, эстэтычная і інш. Тыпастваральныя функцыі. Навукова-метадычная і навукова-даследчая функцыі.

Тэхналагічныя функцыі бібліятэк.

*Тэма 8. Шматконтурная сутнасная мадэль сістэмы «Бібліятэка»*

Сістэмны падыход да вывучэння бібліятэчнай справы. Паняцці «сістэма», «падсістэма», «элемент». Эвалюцыя поглядаў бібліятэказнаўцаў на бібліятэку як сістэму: аднаэлементная мадэль бібліятэкі (М. А. Рубакін, Л. Б. Хаўкіна); двухэлементная мадэль бібліятэкі (І. Т. Маркаў, А. С. Чубар'ян); трохэлементная мадэль бібліятэкі (Н. С. Карташоў, А. Я. Чарняк, І. М. Фрумін).

Чатырохэлементная мадэль бібліятэкі Ю. М. Сталярова. Бібліятэка як шматконтурная (шматузроўневая) сістэма. Элементы першага контуру сістэмы «Бібліятэка»: бібліятэчны фонд, кантынгент карыстальнікаў, бібліятэчны персанал, матэрыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-тэхнічная база. Характарыстыка элементаў: азначэнне, сістэмаўтваральны элемент, знешнесістэмныя і ўнутрысістэмныя функцыі кожнага элемента. Узаемасувязь элементаў сістэмы «Бібліятэка».

Характарыстыка элементаў другога контуру сістэмы «Бібліятэка».

Пяціэлементная мадэль бібліятэкі (В. В. Скварцоў, Н. І. Цюліна, А. І. Астапаў, Я. Л. Шрайберг).

*Тэма 9. Тыпалагізацыя і класіфікацыя бібліятэк*

Азначэнне і суадносіны паняццяў «класіфікацыя» і «тыпалагізацыя», «тып», «від».

Эвалюцыя поглядаў бібліятэказнаўцаў на класіфікацыю бібліятэк: у 20–40-я гг. XX ст., у 50-я гг. XX ст. Іерархічная і фасетная класіфікацыі. Класіфікацыйныя прыметы. Класіфікацыя бібліятэк у залежнасці ад іх сацыяльнага прызначэння, фондаў, катэгорый абслугоўваемых карыстальнікаў, формы ўласнасці, статусу і інш.

Тыпалогія як агульнатэарэтычная праблема бібліятэказнаўства. Распрацоўка праблемы тыпалогіі бібліятэк у бібліятэказнаўстве. Канцэпцыі тыпалогіі бібліятэк М. А. Рубакіна, Е. Н. Мядынскага, А. А. Пакроўскага, І. М. Фруміна, М. І. Акілінай, Р. С. Матульскага, К. С. Селіверставай, Ю. М. Сталярова, М. С. Карташова.

Тыпалагічныя прыметы бібліятэк. Вызначэнне тыпаў бібліятэк у беларускім заканадаўстве. Тыпы бібліятэк, якія вызначаюцца ў адпаведнасці з іх сацыяльным прызначэннем. Публічныя бібліятэкі: тыпалагічныя асаблівасці і віды. Спецыяльныя бібліятэкі: тыпалагічныя асаблівасці і віды. Публічныя і спецыяльныя бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Бібліятэчная справа як галіна дзейнасці

*Тэма 10. Агульная характарыстыка бібліятэчнай справы*

Бібліятэчная справа як галіна дзейнасці па арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання, яе мэты і задачы. Сутнасна-функцыянальная структура бібліятэчнай справы. Характарыстыка складовых частак бібліятэчнай справы: бібліятэчнай дзейнасці (практыкі), бібліятэказнаўства, бібліятэчнай адукацыі, кіравання бібліятэчнай справай.

Асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы. Замацаванне прынцыпаў арганізацыі бібліятэчнай справы ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь. Рацыянальнае размяшчэнне сеткі бібліятэк у адпаведнасці з дэмаграфічным складам насельніцтва і з улікам развіцця ў асобных рэгіёнах галін вытворчасці. Узаемадзеянне і ўзаемавыкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк з мэтай найбольш поўнага задавальнення інфармацыйных патрэб карыстальнікаў. Дзяржаўна-грамадскі характар кіравання бібліятэчнай справай.

*Тэма 11. Бібліятэчныя сеткі і сістэмы*

Дэфініцыя і суадносіны паняццяў «сістэма бібліятэк» і «сетка бібліятэк». Агульная характарыстыка сістэмы бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Нарматыўна-прававая база яе функцыянавання. Умовы арганізацыі сеткі і размяшчэння бібліятэк краіны, асаблівасці адзінай сукупнай сеткі бібліятэк, структура сеткі. Арганізацыя сеткі і размяшчэнне публічных і спецыяльных бібліятэк у горадзе і сельскай мясцовасці.

Сетка ўніверсальных навуковых і публічных бібліятэк мясцовых органаў улады. Нацыянальная бібліятэка Беларусі: яе тыпалагічныя асаблівасці і функцыі як галоўнай бібліятэкі краіны. Універсальныя навуковыя абласныя бібліятэкі: тыпалагічныя асаблівасці і функцыі як буйных рэгіянальных кнігасховішчаў і цэнтраў бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва вобласці. Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма (ЦБС) публічных масавых бібліятэк: азначэнне, прычыны і гісторыя стварэння. Мэты, задачы, структура ЦБС. Функцыі структурных падраздзяленняў ЦБС. Віды ЦБС.

Сеткі спецыяльных бібліятэк. Сетка навуковых бібліятэк Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, сетка бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў, сетка бібліятэк сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і агульнаадукацыйных школ, сетка навукова-тэхнічных бібліятэк, сетка медыцынскіх бібліятэк, сетка бібліятэк аграпрамысловага комплексу, бібліятэкі заканадаўчых, выканаўчых і судовых органаў улады: задачы, функцыі, структура. Дзейнасць галоўных бібліятэк: ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, навукова-педагагічнай бібліятэкі Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі, Рэспубліканскай навуковай медыцынскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі, Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Формы ўзаемадзеяння бібліятэк Рэспублікі Беларусь: каардынацыя, кааперацыя, цэнтралізацыя.

*Тэма 12. Кіраванне бібліятэчнай справай*

Дзяржаўна-грамадскі характар кіравання бібліятэчнай справай у Рэспубліцы Беларусь. Вызначэнне сутнасці кіравання бібліятэчнай справай у Законе «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь».

Дзяржаўнае кіраванне бібліятэчнай справай, яго характэрныя рысы. Органы заканадаўчай і выканаўчай улады ў кіраванні бібліятэчнай справай: іх функцыі, узроўні кіравання. Міністэрства культуры як цэнтральны орган кіраўніцтва бібліятэчнай справай.

Ведамасна-адміністрацыйнае кіраванне бібліятэкамі. Дзейнасць міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў і арганізацый па кіраванні сеткамі бібліятэк і бібліятэкамі.

Роля грамадскіх прафесійных аб'яднанняў і асацыяцый у кіраванні бібліятэчнай справай. Мэты, задачы, структура, дзейнасць Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый ІФЛА, Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, Бібліятэчнай Асамблеі Еўразіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Библиотечные исследования: методология и методика. – М. : Книга, 1978. – С. 5–10, 17–65.

*2. Ванеев, А. Н.* Развитие библиотечной мысли в России (XI – начало XX в.) / А. Н. Ванеев. – М. : Пашков дом, 2003. – С. 9–173.

*3. Ванеев, А. Н.* Библиотековедение в России конца XX века : учеб. пособие / А. Н. Ванеев. – СПб. : Профессия, 2007. – С. 8–68, 72–123, 132–160.

*4. Карташов, Н. С.* Общее библиотековедение : учебник : в 2 ч. / Н. С. Карташов, В. В. Скворцов. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та культуры, 1996–1997. – Ч. 1 : Теоретические основы библиотековедения / В. В. Скворцов. – 1996. – 88 с. ; Ч. 2: Общая теория библиотечного дела / Н. С. Карташов. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та культуры, 1997. – 256 с.

*5. Крейденко, В. С.* Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – М. : Рус. шк. библиотечная ассоциация, 2007. – С. 56–126, 146–165, 215–225.

*6. Мотульский, Р. С.* Общее библиотековедение : учеб. пособие для вузов / Р. С. Мотульский. – М. : Либерия, 2004. – 224 с.

*7.* Российское библиотековедение: XX век: направления, проблемы и итоги. Опыт монографического исследования / Рос. гос. б-ка; сост. и предисл. Ю. П. Мелентьевой. – М. : Пашков дом, 2003. – С. 9–177.

*Дадатковая*

*1.* Библиотечная энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2007. – С. 139–143, 171, 181, 1128.

*2. Бобылева, Н. В.* Библиотековедение: социокультурный подход : моногр. / Н. В. Бобылева. – М. : МГУКИ, 2002. – 165 с.

*3. Ванеев, А. Н.* Библиотечное дело. Теория. Методика. Практика / А. Н. Ванеев. – СПб. : Профессия, 2004. – С. 13–127.

*4. Ванеев, А. Н.* Библиотековедение в России во второй половине XIX века: учеб. пособие / А. Н. Ванеев. – СПб., 1999. – С. 3–41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5. Гусева, Л.* Концепции деятельности библиотек: анализ взглядов библиотековедов-теоретиков и библиотекарей-практиков / Л. Гусева // Библиотечное дело. – 2007. – № 12. – С. 13–18.

*6. Гусева, Е. Н.* Типология библиотек : науч.-метод. пособие / Е. Н. Гусева. – М. : Либерия-Бибинформ, 2007. – 152 с.

*7. Матлина, С. Г.* Библиотечное пространство: в поисках определения (Социокультурные аспекты) / С. Г. Матлина // Науч. и техн. б-ки. – 2013. – № 7. – С. 3–20.

*8.* Миссия и социальные функции библиотек // Коммуникационная культура библиотек : науч.-практ. пособие / С. Д. Бородина, Г. М. Кормишина. – М. : Либерия-Бибинформ, 2008. – С. 5–20.

*9. Мотульский, Р. С.* Библиотека как социальный институт : моногр. / Р. С. Мотульский. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры, 2002. – 374 с.

*10.* Общее библиотековедение: в 3 ч. – М., 2007–2008. – Ч. 1: Теоретические основы : хрестоматия / сост. Р. А. Трофимова [и др.] ; науч. ред. А. Н. Ванеев. – 2007. – С. 18–102, 104–186 ; Ч. 2, т. 1: Учение о библиотеке : хрестоматия / сост. А. А. Фомина [и др.] ; науч. ред. А. Н. Ванеев. – 2008. – С. 5–210, 214–309 ; Ч. 2, т. 2 : Учение о библиотеке : хрестоматия / сост. А. А. Фомина [и др.] ; науч. ред. проф. А. Н. Ванеев. – 2008. – С. 117–210 ; Ч. 3 : Учение о библиотечном деле : хрестоматия / сост. М. Н Колесникова [и др.] ; науч. ред. А. Н. Ванеев. – 2008. – С. 6–90, 95–120, 129–210.

*11.* Словарь терминов по библиотековедению, библиографоведению и информатике : учеб. пособие для студентов / науч. ред. М. Г. Вохрышева. – Самара : СГАКИ, 2003. – 141 с.

*12.* Справочник библиотекаря / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – СПб. : Профессия, 2002. – С. 37–54, 354–387.

*13. Степанов, В. К.* Библиотеки в условиях сокращающегося книжного пространства / В. К. Степанов // Науч. и техн. б-ки. – 2014. – № 3. – С. 7–15.

*14. Столяров, Ю. Н.* Библиотековедение : избр. 1960–2000 гг. / Ю. Н. Столяров. – М. : Пашков дом, 2001. – С. 5–266.

*15. Фядорына, А. І.* Бібліятэчная думка на Беларусі ў 20-я гады / А. І. Фядорына // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі (да 90-годдзя вучонага): матэрыялы навук. канф. – Мінск, 1997. – С. 93–96.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Фядорына, А. І.* Да пытання развіцця бібліятэчнай думкі на Беларусі ў 50-я гады / А. І. Фядорына // Актуальная праблема ў галіне культуры і мастацтва : тэз. дакл. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1994. – С. 69–70.

*17. Шрайберг, Я. Л.* Роль библиотек в обеспечении доступа к информации и знаниям в информационном веке : ежегод. докл. Междунар. конф. «Крым». 2007 / Я. Л. Шрайберг. – Судак ; М., 2007. – 47 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Асноўным сродкам дыягностыкі засваення ведаў і авалодвання неабходнымі ўменнямі па дысцыпліне з'яўляецца рубежны кантроль ведаў, праверка заданняў разнастайнага тыпу, якія выконваюцца ў рамках гадзін, адведзеных на лекцыі (франтальнае апытанне на лекцыях, лекцыя-гутарка), семінарскія заняткі (вуснае апытанне, дэбаты, ролевая гульня, круглы стол, электронная прэзентацыя), самастойную работу студэнтаў.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў накіравана на замацаванне і паглыбленне іх ведаў, развіццё аналітычных навыкаў па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны і прадугледжвае наступныя формы: пісьмовыя працы (рэфераты), электронныя прэзентацыі, самастойнае вывучэнне крыніц, вусныя выступленні, наведванне бібліятэк. Выкананая работа павінна адлюстроўваць ступень засваення студэнтам асноўных тэарэтычных пытанняў бібліятэказнаўства, уменне самастойна мысліць, абагульняць матэрыял, вызначаць дасягненні, праблемы, рабіць высновы. Формамі кантролю СРС з'яўляюцца праверка пісьмовых работ, прэзентацый, гутарка, вуснае і пісьмовае апытанне на семінарскіх занятках і кантрольных работах.

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы студэнтаў

1. Сучасныя канцэпцыі бібліятэкі.
2. Трансфармацыя функцый сучаснай бібліятэкі.
3. Класіфікацыя і тыпалагізацыя бібліятэк (эвалюцыя поглядаў і меркаванняў).
4. Спецыялізацыя дзейнасці публічных масавых бібліятэк.
5. Каардынацыя і каапeрацыя ў бібліятэчнай справе.
6. Сістэма бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі.
7. Канцэпцыі (парадыгмы) навуковага пазнання ў бібліятэказнаўстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА.**
**Раздзел II. ТЭОРЫЯ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,79. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.